УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”

# АКРУЖНАЯ СВЯТЛАНА АРЦЁМАЎНА

## АКТРЫСА, НАРОДНАЯ АРТЫСТКА БССР

## 26 СТУДЗЕНЯ 1947 Г.

**ФОНД № 337**

**ВОПІС № 1**

**1969 г. – 1990 г.**

МІНСК 2019

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 337**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.А. АКРУЖНОЙ | 1-10 | 1-2 |
| 2. | ДАКУМЕНТЫ ПРА С.А. АКРУЖНУЮ | 11-19 | 2-3 |

## Прадмова

**Акружная Святлана Арцёмаўна** нарадзілася 26 студзеня 1947 г. у г. Чарнаўцы Украінскай ССР. З 1965 г. да 1969 г. вучылася ў Беларускім тэатральна-мастацкім інстытуце (курс Дз.А. Арлова). З 1969 г. працуе ў тэатры імя Я. Коласа. Вядомыя акцёрскія работы ў тэатры імя Я. Коласа: Анютка (“Улада цемры” Л.М. Талстога) (дэбют) (1969), Галя Чацвяртак (“А світанкі тут ціхія…” паводле Б. Васільева) (1971), Дачка (“Зацюканы апостал” А.Я. Макаёнка) (1971), Нэлі (“Прыніжаныя і зняважаныя” паводле Ф. Дастаеўскага) (1973), Катрын (“Матухна Кураж і яе дзеці” Б. Брэхта) (1976), Данута (“Клеменс” К. Саі) (1980), Вольга (“Стары дом” А. Казанцава) (1980), Каралева (“Беласнежка і сем гномаў” Л. Усцінава і А. Табакова) (1985), Люся Мерыкур (“Будзьце здаровы!” П. Шэно) (1986), Бобі Мітчэл (“Гэты страсна закаханы” Н. Саймана) (1987), Франка (“Хам” паводле Э. Ажэшкі) (1989), Жанна Д’Арк (“Жанна” Ж. Ануя) (1997). Здымалася у кіно, сыграла ролі: Алена (“Запрос”, Беларусьфільм, рэж. С.А. Нілаў) (1971), Дачка (фільм-спектакль “Зацюканный апостал” па п’есе А. Макаёнка, рэж. Б.І. Луцэнка) (1983), Ганна Карпілава (“Плач перепёлкі”, Беларусьфільм, рэж. І.М. Дабралюбаў) (1990), Маці (“Падение вверх”, Беларусьфільм, рэж. А.М. Трафіменка) (1998).

С.А. Акружной былі прысвоены званні: “Заслужаная артыстка БССР” (1976), “Народная артыстка БССР” (1991).

Лаўрэат прэмій: Міжнароднай “Прэміі міру” Амерыканскага біяграфічнага інстытута (2005), Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь “За духоўнае адраджэнне” (2006), прафсаюзаў БССР (за роль Франкі ў спектаклі “Хам” Э. Ажэшкі) (1991), імя Героя Савецкага Саюза Зінаіды Тусналобавай-Марчанка “За мацярынскую мужнасць” (1996), медалём і ордэнам Францыска Скарыны (1997, 2007), ганаровымі граматамі - Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь (2001), Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь (2002), Камітэта па справах рэлігій і нацыянальнасцяў пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь (2002), Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь (2016), падзякамі - Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2002), Мітрапаліта Мінскага і Слуцкага, Патрыяршага Экзарха ўсея Беларусі Філарэта (2003, 2004), Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь (2011), прызам Беларускага саюза тэатральных дзеячаў “Крыштальная Паўлінка” за яркае таленавітае жыццё ў тэатры (2002), дыпломамі “За лепшую жаночую ролю” - Міждународнага тэатральнага фестываля “Славянские театральные встречи” (Бранск, Расія) (за роль Франкі ў спектаклі “Хам” Э. Ажэшкі) (1990), Міжнароднага тэатральнага фестываля “Славянские театральные встречи” (за роль Кацярыны Іванаўны ў спектаклі “Кацярына Іванаўна” Л. Андрэева (Гомель, 2003), Міжнароднага тэатральнага фестываля “Белая вежа” (за роль Лаўры ў спектаклі “Бацька” А. Стрындберга (Брэст, 2004).

З 2000 г. да 2008 г. з’яўлялася членам Савета Рэспублікі Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь (намеснік старшыні камітэта па сацыяльных пытаннях).

Дакументы С.А. Акружной паступілі ў БДАМЛМ ад самой актрысы ў 1986 г. У выніку навуковага апісання быў створаны вопіс № 1, сфарміравана 19 спраў (68 дак.) за 1969-1990 гг.

Вопіс складаецца з 2 раздзелаў:

Раздзел 1. “Творчыя дакументы С.А. Акружной”. Справы ў ім сістэматызаваны па храналагічным прынцыпе. У гэтым раздзеле змешчаны фатаграфіі С.А. Акружной у ролях і сцэнах з спектакляў, сыграных у тэатры імя Я. Коласа. За 1969-1986 гг.

У канцы раздзела змешчаны: праграма спектакля тэатра імя Я. Коласа П. Шэно “Будзьма здаровы!”, указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб прысваенні С.А. Акружной ганаровага звання “Заслужаная артыстка БССР”.

Раздзел 2. “Дакументы пра С.А. Акружную” сістэматызаваны па тэматычна-храналагічным прынцыпе. У гэтым раздзеле змешчаны артыкулы пра тэатр імя Я. Коласа і яго гастролі і інш.; рэцэнзіі на спектаклі тэатра імя Я. Коласа з удзелам С.А. Акружной, пісьмы ад прыхільнікаў і інш. за 1969-1990 гг.

У канцы раздзела змешчаны фотапартрэты.

Прадмову склала
вяд. архівіст Н.П. Прынько
2019

ПРАТАКОЛ ЭМК №__________

ад "_____"____________20____ г.

ЗАЦВЯРДЖАЮ:

Дырэктар БДАМЛіМ

______________ Г.В.Запартыка

"_____"____________20____ г.

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.А. АКРУЖНОЙ** | | | | |
| 1 | Фатаграфіі С.А. Акружной ў ролі Анюткі ("Улада цемры" Л.М. Талстога, рэж. Б.У. Эрын), сыгранай у тэатры імя Я. Коласа, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам С.А. Акружной, А.М. Труса (у ролі Мітрыча) | 1969 | 3 | 3 | |
| 2 | Фатаграфіі С.А. Акружной ў ролі Чацвяртак ("А світанкі тут ціхія..." паводле Б. Васільева, рэж. Б.У. Эрын), сыгранай у тэатры імя Я. Коласа, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам С.А. Акружной, Ф.І. Шмакава (у ролі Васкова) | 1971 | 2 | 2 | |
| 3 | Фатаграфіі сцэн з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Зацюканы апостал", пастаўленага рэж. А.Д. Смеляковым па п'есе А.Я. Макаёнка, з удзелам А.С. Акружной (у ролі Дачкі), Б.І. Сяўко (у ролі Сына) | 1971 | 3 | 3 | |
| 4 | Фатаграфіі С.А. Акружной у ролях: Катрын ("Восем закаханых жанчын" Р. Тома, рэж. С.В. Кавалёў), Катрын ("Матухна Кураж і яе дзеці" Б. Брэхта, рэж. С.С. Казіміроўскі), Нікі ("Скорыя цягнікі" А.Г. Паповай, рэж. В.М. Раеўскі), сыграных у тэатры імя Я. Коласа | 1976-1978 | 3 | 3 | |
| 5 | Фатаграфіі С.А. Акружной у ролях: Настассі Паўлаўны ("Ах, які пасаж!" паводле п'есы У. Салагуба "Бяда ад пяшчотнага сэрца", рэж. І.В. Баярынцаў), Асі ("Пяты дзясятак" А.А. Бялінскага, рэж. В.Я. Мазынскі), Свірскай ("Я - жанчына" В.І. Мярэжкі, рэж. І.В. Баярынцаў), сыграных у тэатры імя Я. Коласа | 1979-1987 | 3 | 3 | |
| 6 | Фатаграфія сцэны з спектакля тэатра імя Я. Коласа "Развітанне ў чэрвені", пастаўленага рэж. В.Я. Мазынскім па п'есе А.В. Вампілава, з удзелам С.А. Акружной (у ролі Таццяны), Б.І. Сяўко (у ролі Колесава).<br>Фота С. Кохана | 1980 | 1 | 1 | |
| 7 | Фатаграфіі С.А. Акружной у ролі Люські ("Радавыя" па п'есе А.А. Дударава, рэж. В.Я. Мазынскі), сыгранай у тэатры імя Я. Коласа, і сцэны з гэтага | 1984 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | спектакля з удзелам С.А. Акружной, Г.П. Маркінай, Л.І. Трушко | | | | |
| 8 | Фатаграфіі С.А. Акружной у ролі Каралевы ("Беласнежка і сем гномаў" Л. Усцінавай, А.П. Табакова, рэж. І.В. Баярынцаў), сыгранай у тэатры імя Я. Коласа, і сцэны з гэтага спектакля з удзелам С.А. Акружной, Л.А. Антосевай, В.Г. Грушава | 1985 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 9 | Указ Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР аб прысваенні С.А. Акружной ганаровага звання "Заслужаная артыстка БССР", нататка аб узнагароджанні Ганаровай граматай Віцебскага гаркама КПБ і гарвыканкама, у тым ліку С.А. Акружной.<br>Выразкі з газет | 1976, 1986 | 2 | 2 | |
| 10 | Праграма спектакля тэатра імя Я. Коласа "Будзьце здаровы!" з удзелам С.А. Акружной | 1986 | 2 | 1 | |
| | **2. ДАКУМЕНТЫ ПРА С.А. АКРУЖНУЮ** | | | | |
| 11 | Артыкулы Г.Б. Асвяцінскага, Т.Я. Гаробчанкі, М.А. Дзяшкевіча, Т.В. Катовіч пра тэатр імя Я. Коласа, да 60-годдзя з дня нараджэння А.І. Клімавай з упамінаннем С.А. Акружной.<br>Выразкі з газет | 1971-1990 | 7 | 5 | |
| 12 | Артыкулы пра гастролі тэатра імя Я. Коласа ў Бабруйску, Магілёве, Смаленску, Сімферопалі і з рэцэнзіяй на спектакль "Зацюканы апостал" з упамінаннем С.А. Акружной.<br>Выразкі з газет | 1973-1982 | 7 | 7 | |
| 13 | Артыкулы С. Буткевіча, Т.В. Катовіч, К. Кузняцовай, Ю.М. Сохара, прысвечаныя 30- і 35-годдзю з дня нараджэння С.А. Акружной.<br>Выразкі з часопіса і газет | 1977-1986 | 8 | 6 | |
| | * * * | | | | |
| 14 | Рэцэнзіі і інфармацыя М.І. Гарэцкай, Т.В. Катовіч, У.Л. Мехава і інш. на спектаклі "Будзьце здаровы!", "Востраў Алены", "Каманда", "Клеменс" і інш., пастаўленыя ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем С.А. Акружной.<br>Выразкі з газет | 1969-1990 | 14 | 14 | |
| 15 | Рэцэнзіі Т.В. Катовіч, В.В. Нікіфаравіча, С.І. Навумчыка і інш. на спектаклі "Плюшавая малпа на | 1978, 1979, 1988 | 5 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | дзіцячым ложку", "Скорыя цягнікі", пастаўленыя ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем С.А. Акружной.<br>Выразкі з газет | | | | |
| 16 | Рэцэнзіі С. Буткевіча, Б.І. Бур'яна, Т.В. Катовіч на спектакль "Хам", пастаўлены ў тэатры імя Я. Коласа, з упамінаннем С.А. Акружной.<br>Выразкі з газет | 1990 | 3 | 3 | |
| | * * * | | | | |
| 17 | Паштоўкі С.А. Акружной ад прыхільнікаў | 1982, 1984 | 2 | 2 | |
| 18 | Пісьмо Е.М. Малашук у рэдакцыю газеты "Віцебскі рабочы" з просьбай напісаць пра С.А. Акружную | 1985 | 1 | 1 | |
| | * * * | | | | |
| 19 | Фотапартрэты С.А. Акружной, індывідуальныя | 1977, 1982 | 2 | 2 | |

У дадзены вопіс унесена 19 (дзевятнаццаць)

спраў з № 1 па № 19 , 68 дакументаў.

Вопіс склала і апрацоўку
фонда зрабіла

______________________

Дакументы прынялі:

______________________

______________________

"_____"____________20____ г.